■ Спорт-тайм

# Наш суайчыннік стаў найлепшым на еўрапейскім рынгу

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра трыумф баксёра з Маладзечна на чэмпіянаце Еўропы, вяртанне Вікторыі Азаранкі ў элітную сусветную сотню і старт 28-га чэмпіяната Беларусі па футболе.**

**1.** ***Баксёр Дзмітрый Асанаў стаў чэмпіёнам Еўропы сярод моладзі да 22 гадоў у вагавой катэгорыі да 60 кг.*** Турнір прайшоў у румынскім Тыргу-Жыў. У фінальным паядынку спартсмен з Маладзечна атрымаў перамогу аднагалосным рашэннем суддзяў (5:0) над расійскім баксёрам Альбертам Батыргазіевым.



На шляху да фіналу беларус быў мацнейшы за прадстаўніка Турцыі Ніхата Екінчы, а ў 1/2 перамог Атара Наверыані з Грузіі.

Адзначым, што ў кар'еры Дзмітрыя Асанава залаты медаль цяперашняга маладзёжнага чэмпіянату Еўропы — адно з самых значных дасягненняў. Раней ён быў сярэбраным прызёрам першых Еўрапейскіх гульняў у Баку і бронзавым медалістам дарослага чэмпіянату свету 2015 года.

**2.** ***Дзюдаістка Марына Слуцкая заняла другое месца на Гран-пры ў Тбілісі.*** У вагавой катэгорыі звыш 78 кг беларуска адолела ў цяжкім процістаянні Анастасію Сапсай з Украіны. У паўфінале Марына Слуц-



кая атрымала перамогу над французскай Ане Фатумата М'Байро. У вырашальным паядынку Марына Слуцкая сустрэлася з другой прадстаўніцай Францыі Роман Дзіко.

Нагадаем, што летась Марына Слуцкая заняла ў Тбілісі першае месца.

**3.** ***Вікторыя Азаранка вярнулася ў першую сотню сусветнага рэйтынгу і займае цяпер 92-е месца.*** Такому прасоўванню ў рэйтынгу паспрыяла паспяховае выступленне на амерыканскім турніры ў Маямі. Нагадаем, там Вікторыя дабралася да паўфіналу, саступіўшы амерыканцы Слоан Стывенс. Адзначым, што пазней менавіта Стывенс выйграла спаборніцтвы ў ЗША.



У топ-100 сусветнага рэйтынгу ўваходзяць яшчэ дзве беларускія тэнісісткі: Аляксандра Сасновіч займае 49-е месца, Арына Сабаленка знаходзіцца на 60-й пазіцыі.

**4.** ***Беларускія гандбольныя клубы завяршылі выступленне ў Кубку ЕГФ і Лізе чэмпіёнаў.*** Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова ў выязным паядынку 1/8 фіналу Лігі чэмпіёнаў згуляў унічыю з французскім «Нантам», але не змог прабіцца далей, бо тыдзень таму саступіў сапернiку на сваёй пляцоўцы восем мячоў.

БГК працягне выступаць у чэмпіянаце Беларусі і SEHA-лізе. Так, 10 красавіка «мяшкоўцы» на выездзе сустрэнуцца з магілёўскім «Машэкам», а далей адправяцца ў македонскі Скоп'е на «Фінал чатырох» SEHA-лігі. У паўфінале турніру БГК сустрэнецца з мясцовым «Вардарам».

Гандбалісты мінскага СКА прайгралі славацкі «Татран» з Прэшава (34:27) у заключным матчы групавога этапу Кубка ЕГФ. Вынік паядынку для абедзвюх камандаў не меў прынцыповага значэння — яны ўжо страцілі шанцы на выхад у плэй-оф.

Мінскі СКА таксама засяродзіцца на выступленні ў чэмпіянаце Беларусі і Балтыйскай лізе.

**5.** ***Стартаваў 28-ы чэмпіянат краіны па футболе.*** Барысаўскі БАТЭ ў стартавым матчы абыграў навабранцаў вышэйшай лігі, футбалістаў «Смалявічаў», — 1:0. Мінскае «Дынама» выйграла ў жодзінскага «Тарпеда-БелАЗа» — 2:1, футбалісты магілёўскага «Дняпра» з такім жа вынікам узялі верх над «Гарадзеяй». Астатнія сустрэчы стартавага тура завяршыліся ўнічыю: «Прамень» (Мінск) — «Мінск» — 0:0, «Нёман» (Гродна) — «Віцебск» — 1:1, «Гомель» — «Слуцк» — 0:0, «Іслач» (Мінскі раён) — «Тарпеда» (Мінск) — 1:1, «Шахцёр» (Салігорск) — «Дынама» (Брэст) — 0:0.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ** ■

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.38 | 19.49 | 13.11 |
| Віцебск — | 6.26 | 19.40 | 13.14 |
| Магілёў — | 6.28 | 19.39 | 13.11 |
| Гомель — | 6.26 | 19.34 | 13.08 |
| Гродна — | 6.53 | 20.04 | 13.11 |
| Брэст — | 6.56 | 20.02 | 13.06 |

### Месяц

*Поўня 31 сакавіка. Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

### Імяніны

***Пр.*** *Кірылы, Фамы, Фёдара, Якава.* ***К.*** *Ірэны, Рэнаты, Антона, Панкрата, Рышарда.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

**3 КРАСАВІКА**




**1843** год — нарадзіўся Эдмунд Іванавіч Вярыга, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863—1864 гадоў у Беларусі, Літве і Польшчы. Вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце, вёў рэвалюцыйную работу сярод студэнтаў, агітацыю сярод сялян, зблізіўся з К. Каліноўскім. Член віленскага Камітэта руху, удзельнічаў у падрыхтоўцы паўстання. У сакавіку 1863 года быў арыштаваны і прыгавораны да васьмі гадоў катаргі, якую адбываў у Кадаінскіх капальнях разам з М. Г. Чарнышэўскім. Пазней працаваў у Пецярбургу і ва Украіне. Памёр у 1902 годзе.

**1943** год — нарадзіўся (в. Гута Бялыніцкага раёна) Уладзімір Мітрафанавіч Рагаўцоў, беларускі акцёр, заслужаны артыст Беларусі. З 1964 года працуе ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы. Выканаўца драматычных і характарных роляў. Найбольш значныя ролі: Злотнік («Звон — не малітва» І. Чыгрынава), Бальшоў («Свае людзі — паладзім» А. Астроўскага). Зняўся ў фільмах «Людзі на балоце», «Трывожнае шчасце», «Плач перапёлкі», «Помні імя сваё».




**1900** год — нарадзіўся Юрый Нагібін, рускі пісьменнік. У 1943—1945 гадах — ваенны карэспандэнт газеты «Труд». Аўтар зборнікаў апавяданняў і аповесцяў «Перад святам», «Далёкае і блізкае», «Завулкі



майго дзяцінства» і іншых. Пісаў артыкулы пра літаратуру і кіно, кінасцэнарыі. Неаднаразова бываў у Беларусі, пісаў артыкулы пра вызваленне рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Паводле яго аповесці «Старонкі жыцця Трубнікава» пастаўлены фільм «Старшыня»; правобраз галоўнага героя — старшыня калгаса «Рассвет» Магілёўскай вобласці К. Арлоўскі. Аповесць «На ціхім возеры» прысвечана нарачанскім рыбакам. Памёр у 1994 годзе.

**1922** год — Сталін быў абраны генеральным сакратаром ЦК РКП(б). «Тав. Сталін, зрабіўшыся генсекам, засяродзіў у сваіх руках неабсяжную ўладу, і я не ўпэўнены, ці здолее ён заўсёды дастаткова асцярожна карыстацца гэтай уладай», — пісаў у сваім «Пісьме з'езду» з гэтай нагоды Ленін. Ужо праз некалькі гадоў пасля смерці У. І. Леніна Сталін пачаў барацьбу з фракцыямі ў партыйным кіраўніцтве, якая скончылася ў пачатку 1930-х гадоў яго канчатковай перамогай.

**1948** год — кангрэс ЗША прыняў «Закон аб дапамозе замежным дзяржавам», у рамках якога быў рэалізаваны «план Маршала» (праграма аднаўлення і развіцця Еўропы пасля Другой сусветнай вайны на аснове выдзялення амерыканскай дапамогі). Афіцыйна вылучаны дзяржсакратаром ЗША Джорджам Маршалам 5 чэрвеня 1947 года.

## УСМІХНЕМСЯ

**Сёння была на рынку. Даведалася, што ў нас ёсць тры памеры адзення: «на вас», «не на вас» і «трэба мераць».**

— Добры вечар, гэта зона ветлівага абслугоўвання?

— Не, ідыёт, гэта тэрыторыя нізкіх цэн!

**Усю зіму сталі маразы, а вясной пайшоў снег. Нават не ведаю, чаго чакаць ад лета.**




Муж, гартаючы глянцавы часопіс *(задуменна)*:

— Дарагая, а ў цябе ёсць гэты... Як яго — цэлюліт?

Жонка *(напружваючыся)*:

— Так...

Муж *(заміласлана)*:

— І ўсё ў маёй прыгажуні ёсць!

**Дзяўчаты, кідайце худзець! Трэба выглядаць так, каб мужчына хацеў вас з'есці, а не накарміць!**

— Як ты мог пераспаць з ёй, яна ж страшная!

— І дужая...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1237.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 2 красавіка 2018 года.